## Аб’яднаныя вершамі і музыкай

У межах праекта “Кожная пятніца - роднае сваё” атрымальнікі паслуг аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна сталі удзельнікамі літаратурна-музычнай гасцёўні “Паэзія ў душы.”



Сустрэча са сталымі самадзейнымі паэтамі Галінай Даўгашэй, Тэрэсай Адашкевіч, Яўгенам Куст, Мартай Багдановіч, юным аўтарам Надзяй Высоцкай, вучаніцай гімназіі, а таксама з Анжалікай Гадліеўскай, Раманам Малішэўскім і Алісай Астрамовіч вучнямі Ашмянскай дзіцячай школы мастацтваў, з выканаўцам беларускіх песен Канстанцінам Ярашам, якія стварыла па-сяброўску шчырую паэтычна-музычную атмасферу.





Усе разам падзяліліся з прысутнымі сваёй творчасцю - вершамі пра жыццё, любоў да Радзімы, жанчыны, каханне, патрыятызм, любоў да роднага краю. У спалучэнні з музычнымі творамі вершы гучалі яскрава, хвалююча і пераканаўча.

Літаратурна-музычная гасцёўня “Паэзія ў душы” стала крыніцай садружнасці, творчага абмену і напаўнення, калі людзі розных узростаў аб’ядноўваюцца, разважаюць, чытаюць жывое слова, слухаюць музыку.






